Выхаванцы Бялыніцкай дапаможнай школы-інтэрната атрымалі падарункі ад супрацоўнікаў МУС

22.12.2022 16:00 **Аўтар: Вераніка Канюта (/be/tags/veranika-kanyuta)** **Грамадства (/be/gramadstva), Сілавыя структуры (/be/silavyya-struktury)**

А пачалося ўсё з таго, што пад відэапаведамленнем капітана міліцыі Рамана Лашкевіча пра аператыўную абстаноўку ў сталіцы, размешчаным у адным з тэлеграм-каналаў, невядомы пакінуў з'едлівы каментар, які ганьбіць годнасць афіцэра. Асоба анлайн-зласліўца неўзабаве была ўсталявана. Як ні дзіўна, але з гэтым чалавекам Раман Лашкевіч ні па жыцці, ні па службе знаёмы не быў. У выніку суд спагнаў на карысць супрацоўніка органаў унутраных спраў тры тысячы рублёў, якія прадстаўнік галоўнага ўпраўлення ўласнай бяспекі ахвяраваў на дабрачыннасць.

(ht



— Выбар упаў на Бялынічы: гэта мая малая Радзіма, таму дапамогу хацеў аказаць менавіта тут, — расказаў афіцэр. — Разам з дырэктарам школы-інтэрната вызначылі, як з карысцю патраціць суму.

Падарункі для дзяцей атрымаліся выдатныя: у іх з'явіўся вялікі аэрахакей і настольныя гульні, якія развіваюць дробную маторыку: пазлы, мазаіка. Таксама дзяцей парадавалі свежай садавінай і салодкімі навагоднімі падарункамі. Для патрэб інтэрната набылі новы кухонны і гаспадарчы інвентар, бытавую хімію.



Не засталося ў баку і галоўнае ўпраўленне ўласнай бяспекі МУС. У межах акцыі «Нашы дзеці» супрацоўнікі са сродкаў Афіцэрскага сходу набылі салодкія пачастункі, якія выхаванцам школы-інтэрната перадаў начальнік ГУУБ МУС палкоўнік міліцыі Алег Ларын. «Кожнае дзіця незалежна ад узросту верыць у навагоднюю казку і чакае цудаў, — адзначыў ён. — Аднак не кожны мае магчымасць у поўнай меры адчуць бацькоўскі клопат і любоў. Менавіта таму важна падтрымка дарослых: яна дапамагае дзецям выбраць правільную дарогу і стаць годнымі людзьмі. Наведванне такіх устаноў і арганізацыя святаў для дзяцей сталі нашай добрай традыцыяй. Прыемна, што прыклад Рамана Лашкевіча — гэта не адзінкавы выпадак: атрымліваючы падобныя кампенсацыі, супрацоўнікі органаў унутраных спраў, як правіла, ахвяруюць іх на дабрачыннасць».

(ht



Выхаванцы школы-інтэрната з нецярпеннем чакалі гасцей: падрыхтавалі вершы і песні, а святочны настрой падтрымалі Дзед Мароз са Снягуркай. Напрыканцы дзеці зладзілі карагод вакол навагодняй ёлкі і падарылі гасцям сувеніры, зробленыя сваімі рукамі.



Дырэктар школы-інтэрната Аляксандр Мамчанка паведаміў, што ў школе-інтэрнаце выхоўваецца 109 дзяцей, і лішняй дапамога ніколі не бывае. «Заўсёды рады і ўдзячныя гасцям у пагонах, бо кожны іх візіт — сапраўднае свята для нашых выхаванцаў, — падзяліўся Аляксандр Пятровіч. — Радуе, што прадстаўнікі МУС не забываюцца пра нашых дзяцей. Ім вельмі спадабаліся падарункі, асабліва аэрахакей. Упэўнены, каля яго яны будуць праводзіць большую частку свайго вольнага часу».

Вераніка КАНЮТА

Фота прэс-службы МУС

Чытайце таксама

«Ветэраны МУС — гэта адно цэлае з дзеючымі супрацоўнікамі міліцыі» (/be/news/20241107/1730961283-veterany-mus-geta-adno-celae-z-dzeyuchymi-supracounikami-milicyi)

Кубракоў: Ветэраны МУС — адно цэлае з дзейнымі супрацоўнікамі міліцыі (/be/news/20241106/1730899301-kubrakou-veterany-mus-adno-celae-z-dzeynymi-supracounikami-milicyi)

Акадэмію МУС наведалі абітурыенты з усіх рэгіёнаў краіны (/be/news/20241102/1730575683-akademiyu-mus-navedali-abituryenty-z-usih-regiyonau-krainy)

Дэлегацыя МУС на чале з міністрам прыняла ўдзел у рэспубліканскай акцыі «Дай лесу новае жыццё!» (/be/news/20241101/1730461361-delegacyya-mus-na-chale-z-ministram-prynyala-udzel-u-respublikanskay-akcyi)

(https://www.belta.by)

Кубракоў: МУС Беларусі гатова да працягу партнёрства з сербскімі калегамі (/be/news/20241030/1730288688-kubrakou-mus-belarusi-gatova-da-pracyagu-partnyorstva-z-serbskimi-kalegami)

Тэгі:

МУС (/be/tags/mus) | школа-інтэрнат (/be/tags/shkola-internat) | падарункі (/be/tags/padarunki) | Раман Лашкевіч (/be/tags/raman-lashkevich) | Алег Ларын (/be/tags/aleg-laryn) | «Нашы дзеці» (/be/tags/nashy-dzeci-2)

922 прагляда Русский (/ru/news/20221222/1671714960-vospitanniki-belynichskoy-vspomogatelnoy-shkoly-internata-poluchili-podarki)
Друкаваная версія (/be/print/266517)

Падзяліцца:

(https://vk.com/share.php?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20221222%2F1671714044-vyhavanc
(https://connect.ok.ru/offer?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20221222%2F1671714044-vyhavanc
(https://twitter.com/intent/tweet?text=%D0%92%D1%8B%D1%85%D0%B0%D0%B2%D0%B0%D0%BD%D1%86%D1%
(viber://forward?text=%D0%92%D1%8B%D1%85%D0%B0%D0%B2%D0%B0%D0%BD%D1%86%D1%8B%20%D0%
(https://t.me/share/url?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20221222%2F1671714044-vyhavancy-by

Навіны | Папулярнае

13:43 Хто часцей падвяргаецца булінгу ў школе (/be/news/20241107/1730976207-hto-chascey-padvyargaecca-bulingu-u-shkole)

13:11 Работа некаторых аўтобусных і тралейбусных маршрутаў у сталіцы зменіцца ў лістападзе (/be/news/20241107/1730974304-rabota-nekatoryh-autobusnyh-i-traleybusnyh-marshrutau-u-stalicy-zmenicca-u)

12:41 Лукашэнка: Калі Трампу ўдасца спыніць войны, мы вылучым яго на Нобелеўскую прэмію (/be/news/20241107/1730972499-lukashenka-kali-trampu-udasca-spynic-voyny-my-vyluchym-yago-na-nobeleuskuyu)

12:12 Турчын: Кожны год на чэмпіянат па колцы дроў рыхтуем больш складаныя конкурсы (/be/news/20241107/1730970738-turchyn-kozhny-god-na-chempiyanat-pa-kolcy-drou-ryhtuem-bolsh-skladanyya)

11:33 Ускладанне кветак да помніка Леніна адбылося на плошчы Незалежнасці ў Мінску (/be/news/20241107/1730968406-uskladanne-kvetak-da-pomnika-lenina-adbylosya-na-ploshchy-nezalezhnasci-u)

УСЕ НАВІНЫ (/BE/NEWS)

Іншыя матэрыялы аўтара

Лукашэнка: У Беларусі ёсць усё для таго, каб займацца спортам (/be/news/20241106/1730876354-lukashenka-pryme-udzel-u-cyrymonii-urachystaga-adkryccya-u-minsku-baseyna)

Прэзідэнт: Будзем дзейнічаць так, як гэта патрэбна нашай краіне і нашаму народу (/be/news/20241105/1730796972-alyaksandr-lukashenka-vybary-u-belarusi-treba-pravesci-tak-kab-kamar-nosa)

Лукашэнка: Мы людзі абавязковыя. І калі дамаўляемся, свае абавязацельствы выконваем (/be/news/20241105/1730794330-lukashenka-belarus-i-tulskaya-voblasc-rasii-zdolnyya-dasyagnuc-tavaraabarot)

«Трэба зарабляць, як бы не было складана, на знешніх рынках» (/be/news/20241104/1730713449-lukashenka-raspavyou-pra-kadravae-zabespyachenne-sistemy-mzs)

«Беражлівасць — пытанне нумар адзін у адносінах да кадраў» (/be/news/20241104/1730711462-lukashenka-uzgadniu-pryznachenne-novyh-kiraunikou-u-belnaftahim-i-na)

(https://www.butb.by/)

Выбар рэдакцыі

(/be/news/20241030/1730305785-sherag-zmen-pa-pryznachenni-i-atrymanni-pensiy-pracyag-pragramy-syameynaga)

Сацыяльная падтрымка (/be/sacyyalnaya-padtrymka)

Шэраг змен па прызначэнні і атрыманні пенсій, працяг праграмы сямейнага капіталу чакаецца з пачатку наступнага года (/be/news/20241030/1730305785-sherag-zmen-pa-pryznachenni-i-atrymanni-pensiy-pracyag-pragramy-syameynaga)

Пенсіі працоўным — без абмежаванняў, дадатковая падтрымка — сем'ям.

0 211

(/be/news/20241024/1729776432-zhyllyovy-kvadrat-va-ulasnasc)

Жыллёвы «квадрат» ва ўласнасць (/be/news/20241024/1729776432-zhyllyovy-kvadrat-va-ulasnasc)

У апошнія гады колькасць чаргавікоў істотна памяншаецца

0 205

(/be/news/20241105/1730822862-yak-grecca-kab-ne-zagarecca)

Грамадства (/be/gramadstva)

Як грэцца, каб не загарэцца? (/be/news/20241105/1730822862-yak-grecca-kab-ne-zagarecca)

Разам з МНС разбіраемся ў нюансах пячнога ацяплення.

0 133

(/be/news/20241101/1730468284-ushodni-garaskop-na-nastupny-tydzen)

Калейдаскоп (/be/kaleydaskop)

Усходні гараскоп на наступны тыдзень (/be/news/20241101/1730468284-ushodni-garaskop-na-nastupny-tydzen)

Для Блізнятаў падзеі на гэтым тыдні складуцца на іх карысць.

(https://www.butb.by/)

0 241

Нашы партнёры:

(https://center.gov.by/) (http://mininform.gov.by/ru/) (http://pravo.by/) (http://wwv

ЗВЯЗДА (/)

ПАДПІСКА (/BE/SUBSCRIPTION)

© 1998—2024 Усе правы належаць рэдакцыі РВУ “Выдавецкі дом “Звязда”.
Пры выкарыстанні публікацый сайта актыўная гіперспасылка на крыніцу і аўтара абавязкова.

Газета "Звязда" (/be/edition)
Рэклама (/be/advertising)
Праекты (/be/projects)
Архіў (/be/pdf)
Экстрэмісцкія матэрыялы (/be/page/respublikanski-spis-ekstremisckih-materyyalau)

Палітыка (/be/palityka)
Эканоміка (/be/ekanomika)
Грамадства (/be/gramadstva)
У свеце (/be/u-svece)
Культура (/be/kultura)
Калейдаскоп (/be/kaleydaskop)
Спорт (/be/sport)
Нашы выданні (http://zviazda.by/be/about)
Кнігі (http://zviazda.by/be/page/bibliyateka-zvyazdy)

4 527
3 396
3 277
(https://metrika.yandex.by/stat/?id=37842935&from=informer)

(https://vk.com/zviazda) (https://www.instagram.com/zviazda.by/)
(https://t.me/zviazda_online)